**Памяць** вогненных гадоў // Сцяг працы (Міёры). – 1970. — 7 мая. – С. 3 ; 9 мая. – С. 3 ; 16 мая. – С. 2 ; 21 мая. – С. 2 ; 28 мая. – С. 2 ; 11 чэрв. – С. 2 ; 23 чэрв. – С. 2 ; 2 ліп. – С. 3 ; 11 ліп. – С. 3.

## ПАМЯЦЬ ВОГНЕННЫХ ГАДОЎ

**Барыс Рыгоравіч Макавейчук родам в Вінніцкай вобласці. У час Вялікай Айчыннай вайны ён партызаніў у нашай мясцовасці. Спачатку выконваў абавязкі намесніка камандзіра атрада, потым – начальніка аэрадрома Чацвёртай Беларускай партызанскай брыгады. Цяпер жыве ў Днепрапятроўску.**

**У мінулым годзе Барыс Рыгоравіч гасціў на Міёршчыне ў час святкавання 25-годдзя вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў. Нядаўна ён даслаў нам альбом са сваімі ўспамінамі аб тых вогненных гадах. У альбоме ўзноўлен дзённік партызанскага атрада. Рэдакцыя прапануе сваім чытачам некаторыя матэрыялы з гэтага дзённіка. Урыўкі будуць друкавацца ў радзе нумароў.**

### З партызанскага дзённіка Б. МАКАВЕЙЧУКА

**22 кастрычніка 1943 года.** Група партызан у складзе Н. Расамахіна, П. Ажынскага, С. Аўсяннікава, Е. Іванова з атрада Ігнацьева накіравалася на чыгунку Міёры – Друя. Узарваны чыгуначны мост даўжынёй 45 метраў, пашкоджана чыгуначнае палатно на працягу ста метраў. Падарван другі мост даўжынёй 8 метраў.

Вяртаючыся ў атрад мы спалілі драўляныя масты па дарогах Друя – Тычкі і Друя – Мілашова. Пасля вяртання групы з гэтага задання ў атрадзе быў склікан камсамольскі сход. На ім вырашылі пусціць пад адхон варожы эшалон у гонар 26-й гадавіны Вялікага Кастрычніка. Сход быў кароткі, але дзелавы.

Выканаць заданне знайшлося многа добраахвотнікаў. Сярод іх былі інструктар падрыўной справы Х. Гладкоўскі, партызаны С. Ігнацьеў, С. Тарасенка і я.

**26 кастрычніка 1943 года.** Праводзіць падрыўнікоў выйшаў увесь атрад. Пакуль яны ішлі па вуліцы Юркаўшчыны, ім махалі на развітанне рукамі і выказвалі пажаданні ўдачы. Нарэшце падрыўнікі скрыліся за кустамі, селі на падводы і паехалі да ракі Дзісны. Падводы адпусцілі і фарсіравалі раку. Ноччу падыйшлі да чыгункі непадалёку ад Празарок. Тут знайшлі праваднікa і разам з ім узабраліся на насып, сталі прыслухоўвацца, ці не ідзе цягнік. Але нам не пашанцавала. У гэтым месцы немцы баяліся пускаць ноччу цягнікі. Дыверсія сарвалася. З наступленнем раніцы групу заўважылі немцы. Прыйшлося адыйсці ад чыгункі. Увесь дзень знаходзіліся пад абстрэлам. Але адступілі без страт. У адной з вёсак сустрэлі яшчэ некалькі такіх груп з розных атрадаў, якія таксама хацелі пусціць пад адхон варожы цягнік, каб адзначыць гэтым кастрычніцкае свята.

Пасля доўгіх вандраванняў атрад вярнуўся ў свой раён. У той жа дзень група партызан хадзіла ў засаду супраць паліцыі да гарадскога пасёлка Міёры. Тут загінуў у няроўным баі мой лепшы сябра Павел Грабаў. Фашысты нават над загінуўшымі партызанамі чынілі неслуханыя зверствы. Яны адразалі ў іх вушы, нос, выкалвалі вочы. Так паступілі і з Грабавым.

**23 лістапада 1943 года.** Камандаваннем брыгады я назначан намеснікам камандзіра атрада па гаспадарчай частцы. У складзе гаспадарчай часткі былі Г. Абранзон, П. Ажынскі, Ч. Жук, М. Мядзелец, Р. Гіндзель і іншыя. Усе яны займаліся пытаннямі харчавання і абмундзіравання партызан. У раёне дыслакацыі паліцэйскіх гарнізонаў і нямецкіх калоній нарыхтоўваўся харч. У атрадзе былі арганізаваны майстэрні па пашыву і рамонту адзення, абутку, шыліся маскхалаты, выраблялiся скуры і г. д.

**4 студзеня 1944 года.** Будучы на заданнях у Павятах мы затрымалі абоз у дзесяць падвод з мукой, 45 галоў буйной рагатай жывёлы і 8 свіней. Абоз суправаджалі 6 паліцэйскіх. Усё гэта было нарабавана ў насельніцтва. Не ўсім паліцэйскім удалося ўцячы ў вёску. Абоз партызаны захапілі.

**6 студзеня 1944 года.** Група партызан пад камандаваннем начальніка штаба В. Кавалёва і інструктара-падрыўніка Х. Гладкоўскага накіравалася на чыгунку Міёры – Друя. Знішчана пяць кіламетраў тэлеграфна-тэлефоннай сувязі.

**14 студзеня 1944 года.** Пад камандаваннем Красільнікава група з шасці чалавек прабралася ў міёрскі гарнізон. З кватэры жывым узялі дырэктара лягаса – шпіёна.

У гэту ноч быў захоплен другі шпіён Яблонскі ў вёсцы Буралом.

**19 студзеня 1944 года.** Чацвёртая Беларуская партызанская брыгада адчувала недахоп у боепрыпасах. Неабходна было пранікнуць ва Ушацкі раён. Тут партызаны займалі тэрыторыю ўшчыльную да фронту. Яны мелі добрыя пасадачныя пляцоўкі для самалётаў, штодзённа многа боепрыпасаў.

Атрадам Ігнацьева і Бабкіна было загадана зрабіць гэты адказны рэйд і атрымаць боепрыпасы для брыгады. Заданне нялёгкае і адказнае. Прадстаяла фарсіраваць раку Дзісну, перайсці чыгунку на ўчастку Полацк – Ветрына, дзе немцы на ўсім працягу яе мелі ўмацаванні ў выгдядзе бункераў, дзотаў, дзе было наладжана імі няспыннае патруляванне па палатну чыгункі. Кожны раз пераход гэтай чыгункі каштаваў многіх чалавечых жыццяў.

19 студзеня ў снежную завіруху атрады накіраваліся на выкананне задання. Іх абоз выцягнуўся ў калону даўжынёй у два кіламетры. Удзень паспелі пад’ехаць да ракі, пасняхова фарсіравалі яе і праз некаторы час дабраліся да прытока Дзісны, дзе павінны былі перайсці чыгунку паміж Празарокамі і Плісай. З дапамогай правадніка бясшумна падыйшлі да кустарніка, за якім праглядваўся поезд праз чыгунку. Ці то адсутнічала ахова, ці можа немцы перапалохаліся такой калоны, але мы шчасліва перасеклі чыгунку. Лясамі, глухімі дарогамі дабраліся ва Ушацкі раён і размясцяліся ў м. Кублічы.

На пятыя суткі ў наш атрад пачалі паступаць грузы з Вялікай зямлі. За некалькі дзён мы атрымалі вялікую колькасць зброі, боепрыпасаў. Атрады накіраваліся ў зваротны шлях. На гэты раз праз чыгунку нам не ўдалося прабрацца незаўважанымі. Немцы адкрылі ўраганны агонь з буйнакаліберанага кулямёта, аўтаматаў і мінамётаў, якія знаходзіліся ў дзотах. Частка партызан перасекла чыгунку, а частка вымушана была вярнуцца на зыходнае месца ў лес. Праз некаторы час прайшлі ўсе. Заданне было выканана.

**10 лютага 1944 года.** Двума атрадамі пад камандаваннем Ігнацьева і Яфрэмава была арганізавана засада непадалёку ад нямецка-паліцэйскага гарнізона ў Лявонпалі. Хтосьці з мясцовых здраднікаў паведаміў у гарнізон аб засадзе. Немцы выклікалі падмацаванне з трох суседніх гарнізонаў – Слабадскога, Дрысенскага, Бігосаўскага. Усяго іх было каля 250 чалавек. Праціўнік абышоў месца засады з усіх бакоў і навязаў бой, які цягнуўся больш дзвюх гадзін. Партызанам

удалося расчляніць варожыя сілы на дробныя групы. Яны кідаліся з аднаго месца ў другое, натыкаючыся на агонь добра замаскіраваных партызан. Немцы і паліцаі страцілі ў гэтым баі забітымі 38 чалавек і параненымі 30. Тры былі ўзяты ў палон. Страты партызан – два загінуўшых і пяць раненых. Пераўзыходзячы ў сіле варожы атрад пацярпеў паражэнне.

**15 лютага 1944 года.** Разведчыкі пад камандаваннем палітрука Расамахіна ў вёсцы Барсукі агнём з аўтаматаў і вінтовак разагналі паліцыю і тых, хто будаваў бункеры для размяшчэння гарнізона. Гэтай жа групай 16 лютага была разагнана паліцыя ў вёсцы Узмёны.

**18 лютага 1944 года.** Атрады Ігнацьева і Бuваленкі разграмілі паліцэйскі гарнізон у вёсцы Грыгараўшчына. У гэтым баі праціўнік панёс вялікія страты. Асабіста я знішчыў трох самаахоўцаў.

**21 лютага 1944 года.** Паліцыя ўступіла ў вёску Вінагроды з мэтай абрабаваць насельніцтва. Партызанскі атрад пад камандаваннем Андрэева і Кавалёва выступіў насустрач праціўніку і ружэйна-кулямётным агнём прымусіў яго ўцячы.

**10–11 сакавіка 1944 года.** Атрадамі Ігнацьева, Буваленкі і Гарбаценкі пад камандаваннем камбрыга Ермака з удзелам атрадаў Карабкова і Чупрака з брыгады імя Калініна разграмілі тры нямецка-паліцэйскія гарнізоны Шаркаўшчынскага раёна.

У гарнізоне Грыгараўшчына знішчана 14 самаахоўцаў, узяты трафеі: 11 вінтовак, боепрыпасы, 17 коней, 10 свіней, 2 пуды солі.

Атрады Смаленскага палка вывезлі нямецкі харчовы склад.

**20 сакавіка 1944 года.** Праціўнік колькасцю 300–350 чалавек пранік у месца дыслакацыі нашых атрадаў і дайшоў да вёскі Супорніца. Пачаўся абстрэл атрада Дзюміна. Атрад прыняў бой, а праз некаторы час на дапамогу падаспелі атрады Ігнацьева, Дзёміна і Яфрэмава. Партызаны пачалі абыходзіць немцаў з трох бакоў, а затым перайшлі ў наступленне. Праціўнік спрабаваў замацавацца ў вёсцы Хомічы, але не вытрымаў націску і ў беспарадку адкатваўся ў свой гарнізон за Дзвіну. На полі боя знайшлі сабе канец 28 немцаў і паліцаяў.

**22 сакавіка 1944 года.** 150–200 нямецкіх салдат і паліцаяў раніцай пераправіліся праз Дзвіну і пайшлі ў напрамку Заборцы – Алешніцы. Тут яны натыкнуліся на засаду камандзіра ўзвода Грыгорава. Завязаўся бой. Узвод стрымліваў націск праціўніка да падыходу атрада Ігнацьева. Партызаны разбілі немцаў на дробныя групкі, адна з якіх пры бегстве сустрэлася з разведкай атрада Дзюміна. Вораг адступіў, пакінуўшы 15 трупаў.

**29 сакавіка 1944 года.** У гэтую ноч гул матораў запоўніў паветраную прастору зоны партызанскага дзеяння. Нашы самалёты даставілі партызанам зброю і боепрыпасы, якія скідваліся на парашутах.

Па даных разведкі, паліцыя падрыхтавала ў маёнтках Дубінкі, Марынкі і Панізова да вывазу жывёлу і хлеб у гарнізоны Міёр, Дрысы і Дзісны. Мне з групай партызан у 10 чалавек было даручана зрабіць засаду на гасцінцы Міёры – Дрыса. Абоз у 30 падвод у суправаджэнні 10 паліцэйскіх быў захоплен. Паліцаі, натыкнуўшыся на засаду, паўцякалі. Адзін быў забіты. Трафеі – 56 галоў буйной рагатай жывёлы, 28 коней, 47 авечак, 8 пудоў солі, 12 свіней, каля 200 пудоў жыта, 70 пудоў аўса. Усё гэта было дастаўлена ў атрад. Большую частку жывёлы і збожжа партызаны раздалі пацярпеўшым ад фашыстаў жыхарам навакольных вёсак.

Вечарам мяне выклікалі ў вёску Чырвоны Луг, дзе размяшчаўся штаб брыгады. Уручылі загад аб арганізацыі аэрадрома для прыёму самалётаў з грузам для партызан паўночнай групы. Гэтым загадам я быў назначан начальнікам пасадачнай пляцоўкі.

**4 красавіка 1944 года.** Зіма яшчэ ў сваіх правах. Палі пакрыты снегам, а азёры пад тоўстай ледзяной бранёй. Гэта было важна для выбару пасадачнай пляцоўкі.

З выдзеленай групай партызан нарыхтавалі дровы і салому, а ноччу прымалі самалёты. Па рацыі звязаліся з аэрадромам, дзе знаходзілася гвардзейская авіячасць, якая абслугоўвала партызан. Дамовіліся аб сігналізацыі і прыёмцы самалётаў. Лётчыкам за ноч прыходзілася рабіць па некалькі рэйсаў, а нам прымаць па 30–40 самалётапасадак.

Возера Ельня размяшчалася ў цэнтры непраходнага балота Багна-Мох. Тут на астраўку быў адзіны будынак – маленькая хата і хляўчук. Партызаны называлі гэтае месца востравам Рабінзонаю.

На гэты маленькі астравок можна дабрацца толькі зімой. Летам тут па пояс вада і трасіна. Нейкім цудам на астраўку жыў стары. Нарыхтоўваў ён зімой сабе прадукты. Летам лавіў рыбу і так перабіваўся да маразоў.

Возера ад сушы аддзяляла балота на адлегласці 7–8 кіламетраў. На гэтай жа адлегласці быў і нямецкі гарнізон.

За перыяд зімова-вясенніх палётаў намі было прынята 248 самалётапасадак. Аднак не ўсе пасадкі былі шчаслівымі. Самалёт, якім кіраваў Аляксандр Блок, быў падбіт «мессершмідтам». Выйшла са строю хваставое кіраванне. І толькі дзякуючы выпадковасці лётчык пасадзіў на возера машыну, а на наступны дзень партызаны дасталі фанеры ад разбітых скрынак і прыбыўшыя спецыялісты з аэрадрома хутка адрамантавалі самалёт.

Другі самалёт, пілатуемы лётчыкам Навасёлавым, атрымаў пашкоджанне дубліруючай кабіны і бензабакаў. На шчасце, не загарэўся. Але калі ён падрульваў да кастра, было бачна, як з яго выцякаў струменем бензін. Як высветлілася потым, самалёт абстралялі ў паветры. Лётчыка параніла ў спіну. З Вялікай зямлі былі выкліканы інжынеры, тэхнікі, якія адрамантавалі машыну. Але на зваротным шляху самалёт быў насцігнут варожымі сцярвятнікамі, якія запалілі яго. Праўда, Навасёлаў пасадзіў палаючы самалёт на аэрадром.

Пасля гэтага Навасёлаў перасеў на «дуглас» і да нас больш не прылятаў.

Страта самалётаў партызан была вельмі адчувальнай. «У-2» і «Р-5» лічыліся партызанскімі самалётамі. На Ельні яны ў нас былі ў апошні раз 17 і 18 красавіка. Пасля гэтага пачалі будаваць летнюю пасадачную пляцоўку.

Партызанамі праводзілася вялікая работа па збору сродкаў на ўзнаўленне страчаных самалётаў. За кароткі час было сабрана 8 мяшкоў грошай (чырвоныя трыццаткі), многа сярэбраных і залатых рэчаў. Падлічыць грошы не ўдалося, таму што іх было вельмі многа, і мне прыйшлося зашыць асігнацыі ў мяшкі і напісаць суправаджальную запіску, дзе ўказвалася, што каштоўнасці і грошы сабраны 4-й Беларускай брыгадай і накіроўваюцца для пакрыцця ўрону, нанесенага эскадрылляй у час палёту да партызан.

Апошнім рэйсам на возера Ельня на пасадачнай пляцоўцы прызямліліся лётчыкі маёр Касяк і старшы лейтэнант Тарасаў. Сумесна з імі мы падабралі месца для летняй пасадачнай пляцоўкі. Найбольш падыходзячым аказалася памесце Трушчынскага непадалёку ад вёскі Шантырова.

Прышлося шмат папрацаваць, каб зрабіць пляцоўку. Пасадачнае поле павінна было мець 500 метраў даўжыні і 200 шырыні. Яно прылягала з абоіх бакоў да лясного масіву. Трэба было высечыць каля гектара лесу. На вырубленай пляцоўцы пабудавалі пяць бункераў у некалькі накатаў.

На будаўніцтве пасадачнай пляцоўкі з 18 красавіка па 7 мая 1944 года кожны дзень працавала па 250–300 чалавек з розных населеных пунктаў. Рызыкуючы жыццём, людзі прыходзілі

на работу нават з нямецкіх гарнізонаў. Кожнаму хацелася ўнесці свой уклад у справу набліжэння перамогі над ворагам.

Гэта было сапраўды народнае будаўніцтва. Поле быццам усеяна людзьмі. Хто займаўся ачысткай пляцоўкі ад хмызняку, хто планіроўкай, хто падвозкай гравію. Працавалі ў вельмі неспрыяльных умовах. Кожны дзень ішоў дождж. Але работа ні на мінуту не спынялася. Некалькі соцень кубаметраў драўніны было закінута ў ямы і канавы, каб ліквідаваць іх. Месца аказалася балоцістым. Прымянялі пажарныя помпы для адкачкі вады з канаў. З ракі прывозілі на пляцоўку гальку і гравій. Калона падвод з зямлёй, гравіем расцягвалася на кіламетры. Для ўкаткі пляцоўкі было зроблена некалькі каткоў. Іх цягалі чатыры кані. З лесу зямлю насілі насілкамі.

Кожны дзень цікавіліся работай на будаўніцтве пасадачнай пляцоўкі камандзір брыгады тав. Ярмак, камісар тав. Расюк, начальнік штаба тав. Плотнікаў.

**7 мая** работы па будаўніцтве пасадачнай пляцоўкі былі ў асноўным закончаны. У той дзень працавала каля чатырохсот чалавек. Пасля работы ўсе сабраліся на ўскрайку лесу. Настрой быў прыўзняты. Заспявалі песню пра партызан. Нягледзячы на позні час ніхто не спяшаўся ісці дамоў. Стыхійна ўзнік мітынг. Я падняўся на збіты з дошак стол і выказаў усім удзельнікам будаўніцтва аэрадрома шчырую ўдзячнасць ад імя партызан.

**9 мая** надвор’е было вельмі дрэннае. Марасіў дождджык, а гэта не давала магчымасці прымаць самалёты. Пад вечар мы з гісторыкам брыгады А. З. Батанавым (яго называлі ў нас журналістам) вырашылі паехаць у вёску Шантырова, дзе знаходзіўся партызанскі шпіталь, праведаць хворых. Там нас засыпалі пытаннямі, калі прыляцяць самалёты для адпраўкі параненых і хворых на Вялікую зямлю. Там мы і заначавалі.

Раніцай наступнага дня вярнуліся на аэрадром. Неба пачало праясняцца, з-за аблочак паказвалася сонца. Гэта нас радавала. З камандай па ахове пляцоўкі прывялі ў парадак два бункеры, прызначаныя для боепрыпасаў і зброі.

**11 мая** надвор’е зноў не дазваляла прымаць самалёты. Нарэшце, 12 мая дзень выдаўся сонечны. На аэрадроме работы не спыняліся. Ішла нарыхтоўка дроў для кастроў. Дровы складвалі ў штабялі. Камандзір брыгады паведаміў, што калі такое надвор’е захаваецца і ў наступны дзень, то трэба чакаць самалётаў. Гэта ўсіх абрадавала. Мы праверылі напрамак ветру, каб правільна ўстанавіць уваходныя вароты для пасадкі самалётаў. Па ўзгадненні з камандаваннем палявога аэрадрома сігнальныя кастры размясціліся буквай «Г». Загадзя былі выраблены калпакі з чорнай бляхі на выпадак, калі варожыя самалёты выявяць кастры. Гэтымі калпакамі можна закрыць агонь.

Кожную ноч мы з нецярпеннем чакалі самалётаў. А іх усё не было. Увесь час працягвалі работы на пасадачнай пляцоўцы. Укатвалі поле, удалялі ваду, якая збіралася пасля дажджоў.

Ноччу **17 мая** амаль у 24.00 пачуўся гул самалётаў. Не паспеў я даць каманду прыбавіць агню ў кастрах, як сілуэты самалётаў замігалі над пасадачнай пляцоўкай. З дапамогай белай ракеты я асвятліў лётчыкам пляцоўку. Самалёты пайшлі адзін за другім на пасадку. Іх было дзесяць.

Не паспеў першы самалёт прызямліцца, як яго акружылі камандзір брыгады, начальнік штаба, камісар, камандзіры атрадаў. З кабіны выйшаў і прадставіўся памочнік камандзіра палка па лётнай часці маёр В. Ф. Назаранка. Затым выйшаў другі лётчык. Гэта быў Тарасаў, той самы, які зімой першым прыляцеў да нас. Усе паціскалі яму руку, абдымалі.

Пасля гэтага да двух гадзін ночы лётчыкі адпачывалі. Разгаварыліся. Аказалася, што сярод іх ёсць мае землякі з Украіны. Партызаны распытвалі ў лётчыкаў пра навіны з Вялікай зямлі,

расказвалі пра свае справы. Нам вельмі было прыемна пачуць пахвалу маёра Назаранкі, які высока ацаніў нашу пасадачную пляцоўку.

Раніцай мы праверылі пляцоўку. Там-сям падправілі і зноў былі гатовы сустракаць нашых слаўных сокалаў.

З вечара 17 мая на пасадачнай пляцоўцы было ажыўлена. З лесу паказаліся падводы з раненымі партызанамі. Хто мог, ішоў. Усе накіроўваліся да аэрадрома.

У 23 гадзіны я даў каманду запаліць кастры. Мінут праз 30 гул матораў напоўніў наваколле. Гэта былі самалёты, якіх мы чакалі. Зрабіўшы круг над аэрадромам, яны пайшлі на пасадку. Першым прызямліўся Васільеў, за ім Барадзін, Папоў, Нячаеў.

На аэрадроме паявіліся ўсе камандзіры атрадаў, камісары, камандзіры суседніх брыгад.

Праз некаторы час мы развіталіся са слаўнымі сокаламі. У гэту ноч за лінію фронту адправілі 8 раненых нашых партызан.

Кожны дзень з наступленнем вечара пачынае ажываць аэрадром. З 21 гадзіны каманда прыводзіць у парадак пасадачную пляцоўку. Днём аэрадрома пазнаць нельга – гэта суцэльная лесапасадка. Раніцай на ўсёй пляцоўцы паяўляліся елачкі вышынёй 2–3 метры. Так маскіраваўся аэрадром. Пры нагляданні з паветра быў бачны толькі лясны масіў. Вечарам елачкі ўбіралі, і пасадачная пляцоўка гатова была прыняць самалёты.

Салому і дровы для кастроў днём зносілі ў лес, таксама маскіравалі, а вечарам вызначалі напрамак ветру і ў залежнасці ад яго размяшчалі сігнальныя кастры.

**23 мая** зноў прыляцелі чатыры самалёты. Над лініяй фронту іх абстралялі варожыя зеніткі. Але для нашых лётчыкаў усё абыйшлося добра. Яны даставілі боепрыпасы, медыкаменты, газеты. Усё гэта было выгружана ў спецыяльна пабудаваны бліндаж. У 2 гадзіны ночы самалёты накіраваліся ў зваротны шлях.

У 3 гадзіны каманда па абслугоўванні аэрадрома пайшла на адпачынак, але праз паўтары гадзіны да мяне прыбег сувязны і далажыў, што прыляцелі два самалёты. Я на хаду апрануўся і паімчаў туды. Хто б гэта мог без папярэджання заляцець? Вось смельчакі! Машыны пасадзілі без апазнавальных кастроў.

Самалёты загналі ў лес, замаскіравалі. Падыходжу – ды гэта ж Барыс Папоў і Васіль Васільеў. Сапраўдныя асы! Мясцовасць настолькі вывучылі, што зрабілі пасадку без сігнальных агнёў. Аказваецца, у іх было спецыяльнае заданне па высадцы парашутыстаў у раёне Глыбокага. Ноч падыходзіла к канцу, і праз лінію фронта пералятаць было рызыкоўна. Лётчыкі вырашылі правесці днёўку на нашым аэрадроме, а ноччу вярнуцца ў сваю часць.

Ноччу **25 мая** прыляцела 9 самалётаў. На пасадачнай пляцоўцы здарылася аварыя. Лётчык Дзянісаў, які быў вядучым у гэтым залёце, парушыў правілы пасадкі. Ён прызямліў свой самалёт па напрамку ветру, хаця сігнальныя кастры ўказвалі, што ўваходныя вароты з супрацьлеглага канца. За ім самалёт пасадзіў Зелянкоў, зрабіўшы залёт з таго боку, як указвалі кастры. Дзянісаў не ўключыў у сваім самалёце навігацыйных агнёў, і Зелянкоў наскочыў на яго машыну. Пры аварыі пацярпелі начальнік штаба брыгады Плотнікаў і пілот Дзянісаў.

Пашкоджаныя самалёты адвялі ў лес і замаскіравалі. Дзянісава адправілі ў шпіталь, а Плотнікаў адмовіўся перапраўляцца за лінію фронта. Мы выклікалі тэхнікаў для рамонту пашкоджаных самалётаў. На зваротным шляху самалётамі было адпраўлена 14 раненых партызан.

Ноччу з 25 на 26 мая прыляцела 8 самалётаў. Прыбылі гвардыі інжынер-капітан Балакін і гвардыі тэхнік-лейтэнант Дзярэзін для рамонту самалётаў. Лётчыкі даставілі партызанам разам з іншым грузам свежыя газеты.

**26 мая** падняліся ў дзевяць гадзін. Пасля снедання інжынер-капітан Балакін і тэхнік-лейтэнант Дзярэзін пайшлі аглядаць пашкоджаныя самалёты. А мы з Батанавым адправіліся ў трэці атрад за харчовым пайком для лётна-тэхнічнага персаналу.

У 11 гадзін над партызанскай тэрыторыяй з’явіўся варожы самалёт. Бачна, немцы аб чымсьці здагадваліся, таму што «фоке-вульф» абшарыў літаральна ўсе куткі лесу. Але дзякуючы стараннай маскіроўцы пасадачнай пляцоўкі і самалётаў варожаму разведчыку не ўдалося выявіць нічога.

Праз паўгадзіны з’явіліся нашы самалёты. Убачыўшы іх, мы вельмі абрадаваліся. Гэта азначала, што фронт набліжаецца з кожным днём.

Вечарам мы рыхтаваліся да прыёму новых самалётаў. Днём былі раздадзены партызанскім атрадам аўтаматы, боепрыпасы, дастаўленыя напярэдадні з-за лініі фронту, у адпаведнасці з разнарадкай Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Усё было добра, толькі нас вельмі непакоіў стан здароўя начальніка штаба брыгады Плотнікава. Тэмпература ў яго не спадала ніжэй 41–40 градусаў. Камандаванне брыгады, не зважаючы на яго пратэсты, запрасіла самалёт з гандоламі для адпраўкі Плотнікава ў савецкі тыл.

Наступны дзень я правёў у лясной «майстэрні» па рамонту самалётаў. Выдаў груз брыгадзе Шлапакова. Апоўначы прыбылі самалёты. Першым прызямліў сваю машыну Барадзін, а затым Васільеў, да самалёта якога былі прымацаваны дзве гандолы – касеты для адпраўкі Плотнікава. Увесь асабовы састаў брыгады прыйшоў праводзіць свайго сябра і таварыша.

На адным з самалётаў прыляцеў мой колішні камандзір брыгады «За Радзіму» Шырокаў. З ім у нас адбылася ажыўленая гутарка. Але доўга пагаварыць не прыйшлося, таму што прыляцелі на пасадку новыя самалёты.

**29 мая** быў закончан рамонт пашкоджаных самалётаў. У 22 гадзіны 30 мінут лётчык Зелянкоў праверыў спраўнасць сваёй машыны і прапанаваў мне і Батанаву заняць месцы ў кабіне. Самалёт узняўся ў паветра, а праз чатыры-пяць мінут зноў прызямліўся. Усё было ў спраўнасці. Інжынер-капітан Балакін і тэхнік-лейтэнант Дзярэзін у той жа дзень вярнуліся за лінію фронта на адрамантаваных самалётах. Дзесьці апоўначы мы зноў сустракалі самалёты, якія дастаўлялі боепрыпасы, зброю, а на зваротным шляху забралі 13 параненых партызан.

Калі ўсе самалёты зрабілі пасадку, у паветры паявіўся нямецкі самалёт. Я скамандаваў накрыць каўпакамі кастры. Меры былі прыняты своечасова, і самалётаў праціўнік не заўважыў. Праз некалькі мінут у паветры зноў пачуўся гук матораў. Мы не памыліліся, што гэта былі нашы самалёты. Трэба было прымаць. Адкрылі кастры, і самалёты шчасліва прызямліліся. Мы па гуку навучыліся адрозніваць свае самалёты ад варожых.

**30 мая** ў 14 гадзін над нашай тэрыторыяй паявіўся варожы самалёт, які пралятаў над Заходняй Дзвіной і ўзяў курс у напрамку цячэння ракі Дзісны. У раёне Нікалаёва з учарашняга вечара працягваўся бой партызан трэцяга атрада з немцамі і паліцыяй. У двух месцах узнік пажар.

У наступны вечар ліў дождж. Пасадка самалётаў была рызыкоўнай. Але і на залітым вадой аэрадроме мы сустракалі пасланцоў з Вялікай зямлі.

Немцы рыхтавалі карную экспедыцыю супраць партызан. Мы дамовіліся з лётчыкамі, што калі на нашым аэрадроме не будзе запаленых кастроў, значыць, мы не можам прымаць самалёты. Нямецкая авіяцыя робіць бесперапынныя налёты на партызан.

Палаюць у агні вёскі. Немцы наладзілі другую карную экспедыцыю супраць партызан. 1 чэрвеня ў нас на аэрадроме аб'явілі трывогу. Прыбыў памочнік камандзіра брыгады па разведцы Марк Свірыдзенка. Ён загадаў тэрмінова арганізаваць падводы і адправіць боепрыпасы ў напрамку Баркоўшчыны. Мы схавалі ў лесе каўпакі, якімі закрывалі кастры, а месцы, дзе яны гарэлі, засыпалі зямлёй і замаскіравалі галлём. У 14 гадзін рушыў ва ўказаным напрамку абоз з боепрыпасамі.

Днём атрады Ігнацьева, Дзёміна, Буваленкі, Яфрэмава і штаб брыгады былі абстраляны праціўнікам з усіх наяўных у яго агнявых сродкаў. Устаяць было цяжка, і атрады адыйшлі на балота Багна-Мох.

**2 чэрвеня.** Другі дзень жывём на балоце. Спім у вадзе, падаслаўшы галлё. Знізу вада і зверху вада – дождж.

**3 чэрвеня.** Немцы і паліцыя блакіравалі наша адступленне ў Казьянскія лясы. У што б там ні стала трэба было прарваць кальцо праціўніка і выйсці ў тыл карнай экспедыцыі. З гэтай мэтай была створана ўдарная група з трохсот аўтаматчыкаў і кулямётчыкаў, у задачу якой уваходзіў прарыў і забеспячэнне магчымасці адходу атрадам з балота. Але калі атрады і ўдарная група пачалі выходзіць у кірунку вёскі Мнюхі, нямецкія вартавыя пачулі шорах і адкрылі стральбу. Завязаўся бой. Атрады Ігнацьева, Дзёміна, Яфрэмава разам з 16-й Смаленскай брыгадай прарвалі тры лініі карнай экспедыцыі. Пры гэтым была знішчана значная колькасць жывой сілы праціўніка, захоплены трафеі. Прарваўшыя блакаду накіраваліся ў Казьянскія лясы.

Штаб брыгады знаходзіўся з атрадам Буваленкі, які прыкрываў атрад партызан. Прарвацца нам не ўдалося, таму што атрад вымушан быў увесь час адстрэльвацца ад карнікаў. Вакол нас сціскалася пятля экспедыцыі.

Мы вымушаны былі адыйсці ўглыб балота. На карце яно значылася, як непраходнае. Некалькі разоў траплялі ў дрыгву па пояс. Праз некаторы час выйшлі да возера, адкуль узялі курс на поўнач.

**4 чэрвеня.** Увесь дзень манеўравалі па балоце. Ішоў праліўны дождж. Варожая авіяцыя некалькі разоў спрабавала выявіць нас. Але пры паяўленні самалётаў мы старанна маскіраваліся, зарываючыся ў мох.

**5 чэрвеня.** Надвор'е крыху праяснілася. Змучаныя няспынным блуканнем па балоце, мы накіраваліся да вострава «Рабінзона». Раніцай былі ўжо там. Востраў змешан з граззю. Жыць тут нам доўга не прыйшлося. Нас заўважылі варожыя самалёты і сталі скідаць скрынкі, у якіх было па 12–16 супрацьпяхотных мін. Скрынкі разбіваліся, і міны разляталіся ва ўсе бакі і ўзрываліся. Абстрэльвалі нас з паветра з кулямётаў. На шчасце, ахвяр не было.

Як толькі самалёты аддаліліся, немцы адкрылі агонь па востраву з мінамётаў і гармат. Праз некаторы час паявіліся аўтаматчыкі. Мы вырашылі дробнымі групамі адыходзіць ад праследвання ворага. Група, у якой быў я, налічвала 13 чалавек. У нас было 9 аўтаматаў, 2 вінтоўкі і карабін. Я свайму сябру Міхаілу Ісаеву аддаў фінку, каб ён на беразе возера Ельня выкапаў сабе і мне яму-пячору, дзе б можна было схавацца ад экспедыцыі. У гэты час зноў наляцела варожая авіяцыя, і мы разбегліся хто куды. Так я расстаўся з Ісаевым.

Наўкола гарэлі вёскі. Дым слаўся нізка, пахла гарру. Харчаваліся мы астаткамі запасаў сухароў і журавінамі. Сустрэлі групу партызан, якія ішлі з возера Ельня. Яны сказалі, што немцы на гумавых лодках пільна ашчупваюць берагі возера, шукаючы там партызан. Я ажно ўздрыгнуў, успомніўшы свайго сябра Ісаева.

**6 чэрвеня.** Аўторак. Гэты дзень для нас быў трагічным. Усё больш сціскала кальцо цёмная хмара варожай экспедыцыі. Мы ў акружэнні. Выйсці з балота немагчыма. Вырашылі дабрацца да возера Бліжняе. На балоце такіх азёр многа дзясяткаў. Тут заначавалі. На досвітку пайшлі на захад. Карнікі ўсё бліжэй і бліжэй. Ужо выразна чуваць іх галасы. Мы разбіліся на яшчэ больш дробныя групы.

У нашай групе камісар брыгады Фама Расюк і яго ад’ютант Фёдар Глазкін. Вырашылі схавацца на востраве, падыход да якога быў вельмі цяжкі. Кругом багна. Але перш чым залезці ў пропасць, я вырыў углыбленне, залез пад мох і паляжаў там некалькі мінут. А ў галаве тысячы думак. Не, нарэшце, вырашыў я. Тут можна жывым трапіць у рукі катаў. Непадалёку чулася нямецкая лаянка. Карнікі побач. Што рабіць? І вырашылі ісці далей. Пасля стала зразумелым, што паступілі правільна. Немцы прастрэльвалі і прашчупвалі на балоце кожную купіну, кожны бугарок. Тое месца, дзе спрабаваў я хавацца, было зрашочана аўтаматнымі чэргамі, вытаптана нямецкімі ботамі.

Па дарозе натрапілі яшчэ на адно возера. Сустрэлі камандзіра брыгады з жонкай і ад’ютантам. Нічога не заставалася рабіць, як пагрузіцца ў багну, якая так і засасвала чалавека, і такім чынам скрыцца ад карнікаў. Ісці далей не мела сэнсу, бо карнікі маглі заўважыць нас. Месца, дзе мы пагрузіліся ў багну, замаскіравалі галлём і сухой травой. Галовы прыкрылі мохам. На ўсякі выпадак прывялі ў баявую гатоўнасць аўтаматы. Камісар брыгады і яго ад’ютант укрыліся метраў за пяць ад мяне. Камандзір брыгады з жонкай і ад’ютант метрах у трыццаці ўладкаваліся пад мохам. Дзе яны ляжалі, узвышаўся высокі бугор. Непадалёку ад нас плавалі дзікія качкі. Гэта стварала ўражанне, быццам паблізу нікога няма.

І вось я заўважыў першыя фігуры немцаў. Яны ланцугом рухаліся прама на нас. За першым ішлі другі і трэці ланцугі. Карнікі прастрэльвалі кожную купіну. Каго сустракалі з партызан, распраўляліся на месцы, прытым бесчалавечна. Вось яны ад нас у дзесяці метрах. Старанна аглядаюць возера. Мы затаілі дыханне, уважліва сочым за іх паводзінамі. Хтосьці з паліцэйскіх даў каманду прачасаць з кулямётаў і аўтаматаў астраўкі. Раздаліся стрэлы. Міма нас свісцелі разрыўныя кулі. У ход былі пушчаны гранаты. Спужаныя качкі ўзняліся ў паветра. Гэта прыцягнула ўвагу карнікаў, і яны пачалі страляць па птушцы.

Наперадзе балота было непраходным, і карнікі раздзяліліся на дзве групы. Адна з іх пайшла ўлева, а другая ўправа. Калі яны аддаліліся, я падняў галаву і азірнуўся вакол. Паклікаў камісара. Той адгукнуўся. Мы засталіся жывымі. Да вечара хаваліся ў вадзе. Вечарам сталі выкручваць вопратку. Але высушыцца не ўдалося. Зноў пачуліся стрэлы, і мы паўраздзетыя пайшлі блукаць па балоце. Па шляху знаходзілі знявечаныя трупы партызан. Падыйшлі да таго месца, дзе быў схаваўшыся камандзір брыгады. Ён, жонка і ад’ютант былі забіты. Нам не верылася, што страцілі свайго баявога таварыша, добрага камандзіра. Немцы забралі ў іх зброю, боепрыпасы і гадзіннікі. Мы з камісарам і яго ад’ютантам вынеслі цела камандзіра на цвёрды грунт і пахавалі. Гэта дзесьці ў раёне Дульскіх.

Пасля пахавання камбрыга накіраваліся на возера Белае. Распалілі касцёр і крыху абсушыліся. Але было не да адпачынку. Праз некаторы час зноў адправіліся ў дарогу. Гэта былі шостыя суткі на балоце. З прадуктаў заставаліся размокшыя сухары і леташнія журавіны пад нагамі.

**7 чэрвеня.** Мы сёмыя суткі на балоце. Надвор’е добрае. Лёгкі ветрык. А вакол цішыня. Сядзім і слухаем лёгкае шапаценне лісцяў. Да нас далучыліся начальнік разведкі брыгады Марк Свірыдзенка і справавод Клава Грышчанка. Дакончылі апошнія сухары. Прадуктаў больш няма.

Начавалі на балоце. Раніцай наступнага дня ўзялі курс на возера Ельня. Галодныя. Ногі не хочуць слухацца. Ледзь-ледзь хапіла сілы дацягнуцца да возера. Тут сустрэлі трох партызан, сярод якіх адзін быў з каманды па ахове аэрадрома. Ён даў нам некалькі бабоў і два сухары.

Ад карнікаў шукалі ратунак на балоце і сяляне бліжэйшых вёсак. Яны хавалі тут муку, крупы і іншыя прадукты. Уцякаючы ад катаў, многія пакідалі прыпасы і адыходзілі ўглыб балота. У некалькіх месцах мы знайшлі ржаную муку. Вырашылі скарыстаць яе. Але ніякай пасуды для прыгатавання ежы ў нас не было. Калатуху з мукі рабілі прама ў лужыне. Сырое цеста для нас было далікатэсам.

Настаў дзявяты дзень жыцця на балоце. Раніцай адправіліся да месца, дзе знаходзіліся забітыя партызаны, каб пахаваць іх. Сустрэлі журналіста Батанава, начальніка штаба другога атрада Гарбаценку і ўрача Страціўнага. Яны паведамілі, што пахавалі ўжо загінуўшых. Мы вельмі абрадаваліся сустрэчы. Абдымаліся, цалаваліся. Потым разам накіраваліся на востраў «Рабінзона». Там было ўжо сабраўшыся шмат партызан. На востраве рыхтавалі сабе снеданне з мукі. Адны варылі клёцкі, другія калатуху, трэція пяклі ляпёшкі.

Мяне назначылі начальнікам «гарнізона» вострава. Вырашылі арганізаваць тут збор выйшаўшых з блакады партызан. Спалі ноччу на сухіх голлях як забітыя. Раніцай дасталі каня і з яго мяса зварылі суп.

Але на востраве карнікі не далі нам магчымасці згрупіравацца. У 16 гадзін раптоўна з-за кустоў на нас награнуў варожы атрад. Абстралялі нас з кулямётаў і аўтаматаў, затым на нашы галовы паляцелі снарады. Прыйшлося пакінуць востраў. Разбіліся на дробныя групы і ўзялі курс на поўнач, да вёскі Страпчызна. Ішлі цэлую ноч, некалькі разоў правальваліся ў багну. Перад світаннем дасягнулі ўскрайку лесу. Гадзіны ў тры-чатыры перад намі паказаліся першыя дамы вёскі Страпчызна. Далей наш курс павінен быў пралегчы праз вёскі Юркаўшчына, Палякі і ў лес пад Друю. Але далей не пайшлі, таму што рассвітала.

У Страпчызне дасталі тры булкі хлеба. Гэта было для нас сапраўдным святам. Днёўку вырашылі правесці на ўскрайку лесу. Устанавілі дзяжурства. Але і на гэты раз за ўсе адзінаццаць дзён паспаць не давялося. Заўважылі паліцэйскіх. Вымушаны былі, каб не выдаць сябе, адыйсці на балота. Нас было дзевяць чалавек. Абутак увесь час мокры. Скура на нагах паморшчылася і пачала здзірацца. Паяўляліся язвы. А вакол кружылі вароны, каркалі, быццам заклікалі нас стаць іх ахвярамі.

Пад вечар разгулялася навальніца. Гэтага нам толькі і не хапала. Зверху вада, знізу вада, а ўкрыцца няма чым і няма дзе.

Ноччу зноў схадзілі ў Страпчызну і Галінполле, каб дастаць хлеба. Людзі аказаліся вельмі гасціннымі, абагрэлі нас, накармілі і далі прадуктаў з сабой.

У гэты дзень пад вечар на балоце я сустрэў свайго лепшага сябру Міхаіла Ісаева, якога лічыў ужо загінуўшым. Колькі было радасці! Мы абодва плакалі ад шчасця.